Pracownicze Plany Kapitałowe

# PPK – Ашчадныя планы

Праграма даўгатэрміновага накаплення на пенсіі для працаўнікоў, створаная і фінансаваная працадаўцамі і дзяржавай



# АШЧАДЖАННЕ МАЕ СЭНС

Праграма PPK распрацаваная на аснове найлепшага досведу такіх дзяржаваў, як Вялікая Брытанія, скандынаўскія краіны, ЗША, Канада і Новая Зеландыя, дзе такія рашэнні паспяхова працуюць доўгія гады.

**СІСТЭМА АШЧАДЖАННЯ** | усеагульная, дабраахвотная, выгадная

**ТВАЕ ГРОШЫ** | на будучыню, прыватная, перадаецца ў спадчыну

## Адкуль бяруцца накапленні ў PPK?

**Твой рахунак папаўняецца з крыніц:**

**ТЫ - ПРАЦАЎНІК | ад 2% да 4% заробку брутта (калі твой заробак не перавышае 120% мінімальнага заробку, унёсак можа быць скарочаны нават да 0,5%)**

**ТВОЙ ПРАЦАДАЎЦА | ад 1,5% да 4% заробку брутта**

**ДЗЯРЖАВА | 250 зл. аднаразовага першапачатковага ўнёску + 240 зл. гадавой даплаты**

## Свае ашчаджэнні ты забярэш пасля спаўнення 60 гадоў

Сродкі можаш забраць адразу, але найвыгадней забраць 25% накопленых сродкаў за раз  і 75% у якасці мінімум 120 штомесячных выплат (10 год). У такім выпадку ты не будзеш плаціць падатку на прырост капіталу.

**Гэта таго варта**

**www.mojePPK.pl**

PFR Polski Fundusz Rozwoju | Ministerstwo Finansów | KANCELARIA PREZESA RADY MINISTRÓW









## У цябе ёсць магчымасць выкарыстаць сабраныя сродкі раней, у выпадку:



сур'ёзнай хваробы тваёй, твайго мужа ці жонкі, твайго дзіцяці - да 25% сродкаў без абавязку вяртання;



здымеш сродкі на ўласны ўклад пры крэдытаванні кватэры або пабудовы дому - да 100% сродкаў з абавязкам вярнуць цягам 15 год (для людзей узростам да 45 год).



## Усе фармальнасці выканае твой працадаўца

Кожны працадаўца аўтаматычна дадае ў праграму ўсіх сваіх працаўнікоў ва ўзросце ад 18 да 55 год, якія падлягаюць абавязковаму пенсійнаму і інваліднаму страхаванню, апрача працаўнікоў, якія свядома адмовіліся ад выплат у PPK. Тыя, каму больш за 55 год, могуць падаць асобную заяву аб далучэнні да праграмы.

## Апрача таго:

- сабраныя сродкі выключна твае і перадаюцца па спадчыне,
- сабранымі сродкамі кіруюць фінансавыя інстытуцыі, якія адпавядаюць строгім крытэрыям,
- ты ў любы момант можаш спыніць унёскі ў PPK,
- ты ў любы момант можаш аднавіць унёскі ў PPK.



# Выгада для цябе

- **збіраеш ашчаджэнні на прыватным рахунку PPK, на выгадных умовах**
- **ашчаджэнні перадаюцца ў спадчыну**
- **каб пачаць ашчаджаць, ты нічога не павінен рабіць**
- **штомесяц атрымліваеш унёсак ад працадаўцы**
- **на твой рахунак у PPK ідзе першапачатковы ўнёсак і штогадовыя выплаты ад дзяржавы**
- **ты сам вырашаеш, па якой схеме атрымаеш выплаты з PPK**
- **для працаўнікоў з нізкім заробкам працуюць ільготы**
- **нізкія кошты кіравання сродкамі на тваім рахунку ў PPK – не большыя за 0,6% вартасці актываў нетта ад сабранага фонду цягам года**
- **ты ашчаджаеш ў зададзеным фармаце фонду, які будзе аўтаматычна змяняць інвестыцыйную палітыку, адаптаваўшы яе да твайго ўзросту.**